**Д. Ільянкова**

## АСАБЛІВАСЦІ НАРАЦЫІ Ў АПОВЕСЦІ А. БРАВА «ДАРАВАННЕ»

Твор А. Брава «Дараванне» – спроба з адлегласці часу пераасэнсаваць падзеі вайны ўжо не непасрэднымі яе ўдзельнікамі, а пакаленнем, народжаным у мірны час. Аповесць была перакладзена на рускую і нямецкую мовы і выдавалася асобным выданнем у трохмоўным варыянце: «Дарава́нне=Проще́ние=Vergébung» (пераклад на нямецкую – А. Бёма).

**Нарацыя** ў шырокім сэнсе – гэта працэс аповеду, гістарычна і культурна абгрунтаваная інтэрпрэтацыя асобных аспектаў рэчаіснасці з пазіцыі чалавечай асобы. З самага пачатку А. Брава выбірае ***ўскосны дыскурс***

апавядання. Наратар быццам збоку падае інфармацыю і на працягу амаль усяго аповеду застаецца імпліцытным, недыегетычным (па класіфікацыі нямецкага філолага В. Шміда). Гэта значыць, наратар-апавядальнік не самапрэзентуецца, не выяўляецца праз сімптомы апавядальнага тэксту, не вядзе расповед ад першай асобы, не называе сваё імя, не робіць прамых ацэнак. Так у аповесці дасягаецца эфект аб'ектыўнасці.

У цэнтры любога наратыву знаходзіцца пэўная гісторыя. Чытач назірае за душэўнымі пакутамі беларускі Ларысы, якая вымушана даглядаць хворага на Альцгеймер старога немца, свайго свёкра Ганса, які, як высветлілася, калісьці ваяваў у яе родных мясцінах і мог быць датычны да смерці яе землякоў. Паводле В. Шміда, ***падзейнасць*** з'яўляецца абавязковай катэгорыяй для любой нарацыі. Саму падзею даследчык вызначае як змену першапачатковай сітуацыі. Гэта можа быць знешняя сітуацыя ў апавядальным свеце, ці ўнутраная сітуацыя таго ці іншага персанажа як ментальная падзея. Адсюль вынікае падзел на падзейнасць знешнюю і ўнутраную. У аповесці А. Брава «Дараванне» яны цесна спалучаныя паміж сабой.

Нарацыя ў аповесці ўскладнялася незразумелымі да пары да часу паводзінамі Ганса, нібыта не звязанымі паміж сабой яго рэплікамі, «гаворачымі рухамі», партрэтнымі дэталямі. Драматызм аповеду надаюць ***кантрасныя матывы*** гневу, расчаравання, і, урэшце, спачування, прыняцця.

Сюжэтная развязка ў аповесці наступае разам са ***зменай наратара***. Знойдзеныя Ларысай урыўкі з дзённіка Ганса дазваляюць звесці ўсе раней апісаныя эпізоды ў адно і скласці мазаіку цалкам. Яны праліваюць святло на ваеннае юнацтва Ганса, распавядаюць пра каханне да беларускай дзяўчыны Зосі і яго спробу ўратаваць каханую і яе аднавяскоўцаў. На першы план выходзіць «Я»-герой, і аповед пачынае весціся ад імя самога Ганса. Рэзкая змена наратараў супадае з пікам сюжэтнай інтрыгі, завастрае яе і адначасова падрыхтоўвае развязку. Такім чынам, нечаканая знешняя падзея абумовіла ўнутраныя змены ў душы галоўнай гераіні, выклікала карэнны перагляд адносінаў да старога немца, абудзіла эмпатыю, пачуццё даравання, што і адлюстравалася ў назве рамана.

Як адзначае В. Шмід, нарацыя з'яўляецца вынікам кампазіцыі, якая арганізуе падзеі ў адпаведным парадку, прычым у кампазіцыі актывізуецца сэнсавы патэнцыял, закладзены ў аповедзе. Ідэя аповесці палягае ў рэчышчы быкаўскага гуманізму, паказвае значнасць чалавечага фактару ў механізме ваенных дзеянняў, і наратыўныя прыёмы адыгрываюць вялікую ролю ў данясенні асноўнага ідэйнага пасылу твора.